

Download



Вясна: Палітвязні Беларусі

**!!Мінгарсуд пакінуў без змены прысуды па «справе чата». 11 палітвязняў хутка этапуюць у калоніі на 5-9 гадоў**

23 лістапада Мінгарсудзе разгледзелі апеляцыю па справе ўдзельнікаў чата, па якой 11 яе фігурантаў былі асуджаныя **на тэрміны ад пяці да дзевяці гадоў**.

Судовая калегія пад старшынствам суддзі **Людмілы Шапашнікавай** нязначна змяніла рашэнне Заводскага суда. Яна пастанавіла залічыць **Аляксандру Юрчыку** тэрмін адбыцця пакарання не з 30 верасня, а з 29 верасня па другога кастрычніка 2020 года.
Таксама рэчавыя доказы – газавы балон і аўтамабіль, які належаць **Юрыю Бялько**, – канфіскаваныя як сродкі здзяйснення злачынства. **Арцёму Касакоўскаму** вярнулі чахол, а **Арцёму Міцуку** – карту памяці.

У астатняй частцы прысуд пакінуты без зменаў. Гэта значыць, што хутка 11 палітвязняў будуць этапаваныя ў калоніі.

**“Вясна” распавядала гісторыі фігурантаў справы:**

**Гісторыя палітвязня Расціслава Стэфановіча – архітэктара, які хацеў, каб беларусаў пачулі**

Context

Embed

View In Channel

```
<script async
src="https://telegram.org/
js/telegram-widget.js?22"
```

Copy